Источник: **«Звязда» - 2012-09-15**

# Творчы партфель

### Ці мог бы ўмясціцца ў яго 13-томнік паэта?

Збор твораў Максіма Танка быў прадстаўлены ў Дзяржаўным музеі беларускай літаратуры: выданне ажыццяўлялася з 1996 года, першыя тамы выйшлі ў 2006 годзе, апошні — у 2012-м. Ацаніць новае выданне можна на фоне кніг Танка, якія выдаваліся пры яго жыцці, пры яго непасрэдным клопаце: у музеі адразу сустракае невялікая выстава, прысвечаная 100-годдзю народнага паэта. Кніжкі, якія паўплывалі на яго, кніжкі, над якімі працаваў ён, нават газеты, у якіх працаваў, напрыклад, падчас вайны. Адна паліца глядзіцца вельмі трывала, "па-танкаўску": кнігі, складзеныя ў стос на фоне яго любімага партфеля з рудой скуры — ну нібыта самі просяцца ў яго. А хто ведае, можа, у ім гаспадар і насіў свае рукапісы, з якіх потым складваў кніжкі? Таму гармонія паміж рэчамі і сутнасцю рэчаў атрымалася.

Рэчы заўсёды цікавяць. Любімыя рэчы людзей, якіх ведаюць усе, нібыта захоўваюць іх цеплыню характар і звычкі іх нясуць далей — і ёсць адчуванне жывога чалавека.




І ёсць адчуванне чалавека на гэтай выставе ў музеі. Медаль за абарону Масквы — такую ж атрымаў Яўген Скурко. Кавалак руды, якую Танк прывёз з Чылі, драўляная трэсачка — з Англіі, калі хацеў (і была магчымасць) трапіць у музей Уільяма Шэкспіра, але там якраз ішла рэстаўрацыя. дык хоць трэска ад Шэкспіра... З Кітая — дык наогул цэлы альбом, аформлены з адмысловым каларытам. Фотаздымкі адлюстравалі тую вандроўку, але пададзены яны разам з выразкамі з газет, сярод іерогліфаў. Цікавае было жыццё, насычанае...

Ларыса Цімошык. Творчы партфель

Гэтыя рэчы, сувеніры, прывезеныя з розных краін, у музей перадаў сын паэта Максім. Як і частку сямейных фотаздымкаў. Цікава на іх глядзець. Асабліва на старыя, маленькія фотакарткі 1930-х гадоў глядзіш і спрабуеш пазнаць людзей, якія разам з маладым Танкам на іх... Сямейныя фотаздымкі, з дзеткамі, з нашчадкамі: Танк з унукам-немаўлём на руках — шчаслівы дзед. Ёсць здымкі з сябрамі-пісьменнікамі: з Лужаніным, Брылём, якія былі ў яго ў гасцях, наогул шмат хто на Нарачы ў яго бываў. Фота з апошняй вандроўкі на радзіму 28 кастрычніка 1994 года, больш ён на Мядзельшчыну ўжо не прыязджаў. І цудоўны здымак: дарога на Пількаўшчыну, да бацькоўскай хаты. Аўтар — вядомы фотамайстар Уладзімір Крук. Яго дочкі, разбіраючы архіў бацькі, вырашылі перадаць у літаратурны музей вялікую частку здымкаў — асобная серыя, прысвечаная Быкаву, і серыя, прысвечаная творчасці Танка. Да юбілею паэта — шыкоўны набытак музея, і галоўнае — своечасовы, ёсць што паказаць наведнікам.

Справа ў тым, што Дзяржаўны літаратурны музей — даволі малады, яму 25 гадоў. А беларуская літаратура — сталая. Усе архівы пісьменнікаў XX стагоддзя захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва — дзеля гісторыі, каб уся спадчына зберагалася, рукапісы, дакументы, каб іх потым было зручна вывучаць даследчыкам. Таму ў музеі лічаць, што ім вельмі пашанцавала атрымаць здымкі і некаторыя рэчы Максіма Танка. Таму што, акрамя таго, што творчую спадчыну літаратара вывучаюць даследчыкі, у яго чытачоў, простых людзей, павінна быць магчымасць дакрануцца, пазнаёміцца з тым, што мае дачыненне да творцы. Асабліва, калі творца — народны паэт. У музей прыходзяць людзі і праз гэтыя рэчы, сведчанні жыцця таленавітых людзей, яны іх лепш адчуваюць.

Могуць адчуць, напрыклад, як Яўген Скурко аднойчы зразумеў, што можна пісаць па-беларуску! Ён жа польскую мову ў школе вывучаў, але аднойчы яму ў рукі трапіла дзіўнае выданне "Беларускі летапіс". Здзівіўся: пішуць жа на той мове, на якой ён гаворыць! Мова прыйшла аднойчы і прайшла праз жыццё: пра гэта сведчаць яго кніжкі. І нават рукапісы апошніх гадоў. Аркуш з радкамі, пазначаны 1994 годам, — гэта ж рука Танка!

Радкі Танка, думкі, артыкулы, выступленні — усё разам цяпер таксама даступнае чытачам праз Збор твораў у 13-ці тамах. Праца над ім ажыццяўлялася Інстытутам мовы і літаратуры імя Янкі Купалы і Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выдавецтвам "Беларуская навука". Канцэпцыю выдання распрацаваў літаратуразнаўца Уладзімір Мархель. У прадмове крытык і літаратуразнаўца Мікола Мікуліч дае аналіз творчасці паэта. Выданне ўключае ўсе вядомыя вершы і паэмы Максіма Танка — практычна храналогію выхаду зборнікаў можна прасачыць. Можна прачытаць апавяданні і нататкі, пераклады паэзіі і прозы з 40 моў свету. Але не толькі творы зацікавяць сённяшняга чытача. Таму што заўсёды хочацца лепш пазнаць самога чалавека, якога больш няма. Але распавядуць пра яго, напрыклад, лісты да жонкі, бацькоў, дзяцей, да тых блізкіх людзей, з якімі можна было абсалютна шчыра пра ўсё казаць, давяраючы свае спадзяванні і сумненні. І нават самі імёны сяброў і калег-пісьменнікаў, вядомых творцаў, з якімі Танк ліставаўся, скажуць пра яго як пра чалавека шмат. Але ж можна яшчэ прачытаць і самі лісты. У збор уключана перапіска розных гадоў, і гэта таксама дае магчымасць адчуваць, як час уплываў на чалавека і як творчы чалавек мог (ці не мог) упісвацца ў рамкі, якія выстаўляў час у сувязі са зменай паветаў у грамадстве. Асобныя лісты Танка друкаваліся ў перыёдыцы, але цяпер яны прадстаўлены больш поўна. Пра тое, чым паэт жыў штодня, распавядуць яго дзённікі.

Упершыню прадстаўлены архіўныя дакументы, якія захоўваюцца не толькі ў Беларусі, але і ў Польшчы, Літве, Расіі...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**Арсень Ліс, доктар філалагічных навук:**

— Прыемна бачыць 13-томнік нашага выдатнага паэта, еўрапейскага паэта. Я меў дачыненне да працы над выданнем, быў запрошаны як чалавек, які ведае Заходнюю Беларусь. Я каментаваў дзённікі "Лісткі календара". Надзвычай цікавая кніжка, бо якраз ахоплівае той перыяд жыцця Танка, калі ён складваўся і фарміраваўся як чалавек і асоба, у падполлі Заходняй Беларусі, калі ён складваўся і фарміраваўся як паэтычная асоба. У гісторыі нашай літаратуры гэта ці не адзіны выпадак, калі пісьменнік на працягу ўсяго некароткага жыцця вёў дзённікавыя запісы. Яны раскрываюць працэс творчасці, раскрываюць эпоху, раскрываюць чалавека, час, у якім жыў пісьменнік. Я апошнія гады даволі шчыльна працаваў з паэтам, бываў у яго дома, размаўлялі, нешта запісваў з гэтага. Гэта дало мне магчымасць пракаментаваць яго дзённік "Лісткі календара" і ўвогуле лепш разумець яго як творцу, як чалавека, тое, як ён успрымаў час, асабліва апошнія гады, калі яго жыццё аказалася на зломе эпохі.

**Вячаслаў Рагойша, прафесар:**

*— Гэта скарб — 13 залатых тамоў. Вядома, далёка не ўсё ў гэтай скарбонцы сабрана. Магло б быць і 15 тамоў... Нездарма ж апошнія тамы атрымаліся тоўстымі, калі шмат што хацелася змясціць. Але цяпер, адштурхоўваючыся ад гэтых тамоў, мы можам глядзець: што ж яшчэ не ўвайшло? Будзе крытыка, але ж цяпер усё роўна гэтае выданне апынецца ў цэнтры ўвагі, а не папярэдні шасцітомнік. Ёсць цэлы том лістоў, і калі яго ўбачаць тыя, у каго захоўваюцца лісты, то пачнуць дасылаць — і гэта можа быць грунт ужо для новых тамоў. У нас ёсць добрая аснова. Хачу заклікаць: давайце будзем далей даследаваць, вывучаць, прапагандаваць творчасць Максіма Танка і шукаць новыя творы, новыя тэксты для новых тамоў, а потым, можа, і для поўнага збору твораў.*

**Анатоль Верабей, кандыдат філалагічных навук:**

*— Я з'яўляюся рэдактарам першага тома, куды ўвайшла лірыка Максіма Танка 1930-х гадоў, ёсць творы, якія не ўключаліся ў папярэднія выданні, у паэтычныя зборнікі. Гаворачы пра заходнебеларускі перыяд, хачу сказаць, што 1930-я гады — гэта матрыца будучай творчасці Максіма Танка. Крыніца яго творчасці — заходнебеларускае жыццё і традыцыі сусветнай літаратуры. Перад ім, як і перад яго папярэднікамі і калегамі — Купалам і Коласам — побач з пытаннямі сацыяльнага плана стаяла нацыянальная адраджэнская задача. І ён яе вельмі дасканала ўвасобіў у сваёй творчасці. Ёсць савецкая літаратура, ёсць заходнебеларуская. Але гэта наша адна літаратура. І мне думаецца, што ў 1930-я гады Танк выратаваў беларускую літаратуру: ён — адна з самых яркіх постацяў беларускай літаратуры 1930-х гадоў. Гэта вялікі еўрапейскі паэт, яго трэба разглядаць у кантэксце таго ж Поля Элюара...*